*Гоўзіч І.М.*

# БЕЛАРУСКАЯ ЛІТАРАТУРА. V КЛАС



## РАЗДЗЕЛ V. ЛІТАРАТУРНЫ ТВОР — СКЛАДАНАЕ І НЕПАДЗЕЛЬНАЕ МАСТАЦКАЕ АДЗІНСТВА

1. Уважліва перачытайце урывак з паэмы Якуба Коласа «Новая зямля» «Дарэктар», падзяліце яго на часткі, прыдумайце загаловак да кожнай з іх. Падрыхтуйце **кадрапалан** да урыўка, асаблівую ўвагу звярніце на апісанне знешнасці і паводзінаў галоўных герояў.

2. **Вы — Якуб Колас. Раскажыце пра сваё дзяцінства і юнацтва па наступным плане**. Самы лепшы адказ атрымаецца, калі вы будзеце карыстацца ўрыўкамі з паэмы «Новая зямля»:

1) Сапраўднае імя, імя па-бацку і прозвішча.
2) Дзе нарадзіўся.
3) Кім працаваў бацька.
4) Самы любімы сваяк.
5) Як праходзіла вучоба.
6) Чым займаліся дзеці ў вольны час.

3. Падрыхтуйце **мастацкі пераказ** любога эпізоду ўрыўка з паэмы «Дарэктар», асаблівую ўвагу звярніце на выкарыстанне аўтарскіх слоў і сінтаксічных канструкцый

4. Падрыхтуйце **інсцэніроўку** драматычнага абразка Алеся Гаруна «Датрымаў характар». Размяркуйце функцыі:

Рэжысёр — вызначае месца, час, інтэр'ер дзеяння, колькасці персанажаў, іх размяшчэнне на сцэне (мізансцэніраванне).

Касцюмер — вызначае, як выглядаюць героі.

Акцёры — характарызуюць сваіх герояў, вызначаюць іх інтанацыі, выконваюць ролі перад класам.

Тэатральныя крытыкі — рэцэнзіруюць (пішуць крытычны водзыў) работу тэатральнай групы.

Гледачы — выказваюць свае ўражанні.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

5. Узгадайце смешны выпадак са школьнага жыцця, напішыце невялікае **сачыненне-мініяцюру ў форме пісьма** да Зюка і Вінцуся, дзе апісваецца ваш кур’ёзны выпадак.

6. Узгадайце адну з самых сумных падзей у Вашым жыцці. Падумайце, як можна выразіць уражанне ад яе, якія сродкі мовы выкарыстаць, каб выклікаць у чытачоў адпаведныя пачуцці і эмоцыі.

7. Паразважайце над пытаннем: «Што прыносіць дзецям вайна?» і напішыце **сачыненне** «Мае адносіны да маленькага героя, які абараняў сям’ю, Радзіму» і намалюйце букецік васількоў і жыта ў знак павагі да Міколкі.

8. Прачытайце верш Рыгора Барадуліна «Палата мінёраў», што аб’ядноўвае яго з вершам «Бацьку», а чым яны адрозніваюцца:

Руку аднагодак працягвае мне,
Пацісну я куксу ў шрамах, бы ў разорах,
І порахам
ды марганцоўкай дыхне
З раённай бальніцы
«палата мінёраў».
Далёка на захад адкочваўся гром.
Гулялі ў вайну мы —
у нашых і немцаў,
Вайна ж,
пазалёгшы за кожным кустом,
Глядзела навокала
позіркам немым.
Мы рана сталелі ў зямлянках сырых,
Але забываліся цацкі няскора.
І рваліся «цацкі»...
І ўрач гаварыў:
— Яшчэ папаўненне
ў палату мінёраў...
Здавалася,
ў цішы
рыпела зямля
На восі,—
нібы на пратэзе,—
у зморы.
Пасля перавязкі
(ой, раны смыляць!)
Спявала «Арлёнка»

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

палата мінёраў.
Вятрыска лісты нам
на шыбіну клаў,
Рабіны
рукамі здаровымі
гойдаў.
І доўга не мог нас даклікацца ў клас
Той верасень
сорак чацвёртага года...
З пустым рукавом
сын вярнуўся дамоў,
А маці, як яблыня, белая
з гора...
Хай порахам толькі
запахне ізноў,
Вы ўчуеце, хлопцы,
з палаты мінёраў!
Ты помніш:
асколак абвугліла кроў,
Ты ведаеш міны
здрадлівы нораў...
Белабілетная ў дваццаць гадоў, —
Ты ў першым запасе,
палата мінёраў!

Запоўніце табліцу

| **Творы** | **Агульнае** | **Адрознае** |
|---|---|---|
| | | |

9. Запішыце ў сшыткі асацыятыўны рад да слоў «Мама» і «Бацька» і складзіце аднайменныя **сінквейны**.

10. Паразважайце над словамі К. Чорнага «Шануйце, дзеці, дружбу, гэта самае дарагое і важнае, што ёсць у чалавека». Дружба павінна быць вялікая, моцная і вечная. Вырастайце вялікія і зберагайце праз усё жыццё дружбу. І ведайце — асабліва моцнай павінна быць тая дружба, што ўстанаўліваецца ў маленстве і ў маладыя гады». Паспрабуйце запісаць у літаратурны сшытак **словы-асацыяцыі да паняцця «сапраўдны сябар»**.

11. **Напішыце ліст** да вашага сябра, дзе вы просіце ў яго прабачэння задрэнны ўчынак.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

12. Зрабіце **цытатную характарыстыку** герояў твора Генрыха Далідовіча «Страта» Міці і Стася.

| Імя героя | Рыса характару | Цытата |
|---|---|---|
| | | |

13. Паразважайце над народным выслоўем «Той не можа быць другам, хто ў бядзе абыдзе кругам» і падрыхтуйце **вуснае сачыненне-мініяцюру**.

14. **Выпішыце са слоўніка** тлумачэнне паняццяў «спагадлівасць» (уласцівасць спачування каму-небудзь), «дабрата» (чуласць у адносінах да людзей), «міласэрнасць» (схільнасць да спагады іншым, уменне рабіць дабро)і словы-асацыяцыі да гэтых паняццяў. Ці ўласцівы гэтыя пачуцці Стасю, свой адказ абгрунтуйце?

15. Падрыхтуйце **вуснае сачыненне-разважанне** на тэму «Сапраўдныя сябры. Якія яны?».

16. Складзіце **кадраплан** апавядання Генрыха Далідовіча «Страта». У працэсе работы над кадрапланам выкарыстайце наступную табліцу:

| Сцэна і яе загаловак | Персанажы і адносіны паміж імі | Дзеянні, рухі персанажаў | Пейзажны фон | Музычнае афармленне ці цытаты з тэксту |
|---|---|---|---|---|
| 1. | | | | |
| 2. | | | | |
| 3. | | | | |
| 4. | | | | |

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ